# Ракаўскі манетны скарб 1840 г.

Ірына КОЛАБАВА

Дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства БДУ культуры і мастацтваў кандыдат гістарычных навук



Прыблізна палова ад усяго аб'ёму адкрытых на тэрыторыі Беларусі на працягу XIX–XXI стст. і ўведзеных у навуковы абарот манетных скарбаў па розных прычынах не паступіла ў музейныя фонды краіны, а засталася толькі зафіксаванай на старонках пісьмовых крыніц.

Існуе таксама значная колькасць неапублікаваных архіўных матэрыялаў, у якіх захаваліся звесткі аб выпадках знаходжання грашовых дэпазітаў, прычым частка гэтых фактаў даследчыкам невядома. Пошук і збор такой інфармацыі – карпатлівая і, магчыма, бясконцая навуковая праца.

У XIX – пачатку XX ст. выяўленыя дэпазіты рэгістраваліся Імператарскай Археалагічнай камісіяй (1859–1918) у адпаведнасці з парадкам, які існаваў на той час. Найбольш цікавыя манеты са скарбаў па рашэнні камісіі перадаваліся ў музейныя калекцыі, за што знаходчык атрымліваў адпаведнае ўзнагароджанне. Астатняя частка дэпазіту (у залежнасці ад абставінаў) або вярталася знаходчыку, або ішла на пераплаўку на манетны двор. У асобных выпадках дублетныя экзэмпляры з дзяржаўных музейных нумізматычных калекцый прадаваліся прыватным збіральнікам. Сёння архівы Археалагічнай камісіі захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі матэрыяльнай культуры Расійскай акадэміі навук.

Адной з найбольш значных інфармацыйных крыніц, што ўтрымліваюць звесткі аб фактах адкрыцця грашовых дэпазітаў на беларускіх землях, з'яўляюцца матэрыялы фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ) (Мінск). Прыкладам падобнай фіксацыі стала знаходка ў 1840 г. манетнага скарбу ў маёнтку Ракаў Мінскай губерні, узгаданая ў неапублікаваных архіўных матэрыялах фонду Мінскага павятовага суда (1796–1873). Звесткі аб гэтым дэпазіце адсутнічаюць у вядомых зводках манетных скарбаў [2].

Першае пісьмовае ўзгадванне аб Ракаве адносіцца да XV ст. Яго ўладарамі былі прадстаўнікі вядомых шляхецкіх родаў. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай (1793) гэтая тэрыторыя ўваходзіць у склад Расійскай Імперыі. З пачатку XIX ст. ракаўскія землі перайшлі да іх апошняга прыватнага гаспадара – дваранскага роду Здзяхоўскіх. Менавіта на землях памешчыка Здзяхоўскага ў 1840 г. і быў знойдзены даволі значны па аб'ёме манетны скарб.

Справа аб знаходжанні гэтага дэпазіту разглядалася ў Мінскім павятовым судзе і распачыналася яна рапартам ад 18 чэрвеня 1840 г. мінскага павятовага прыстава ў земскі суд. У ім паведамлялася, што сялянка памешчыка Здзяхоўскага Ганука Іосіфаўна Дусінаўна знайшла «в горшочке денег старой серебряной монеты всего 220 штук» [1, арк. 1].

Кіраўнік маёнтка Геранім Яроцкі, даючы паказанні, «объявил, что крестьянка помещика Здеховского Ганука Дусиновна..., нанятая здешним евреем ...на денную работу, где находясь копала землю для насыпа домика им построенного, будто бы нашла в горшочке денег, что усмотрел тот еврей, отобрал от ней и обратил в свою пользу...» [1, арк. 2, адв. 2].

Пры допыце самой Ганулі высветлілася, што ёй «от роду 28 лет», православной веры, «холоста, крестьянка помещика Здеховского, ... грамоте не умеет... была нанята раковецким евреем прозванием ей неизвестным... на денную работу» [1, арк. 3]. Капаючы зямлю, яна «нашла горшочек величиною... полагать более кватерки (кватэрка – $^1/_4$ кварты = 0,175 л. – І.К.) с деньгами ей неизвестными, поскольку приметила Древнего Царствования в штуках величиною обыкновенною настоящих польских и прусских злотников, ...схвативши тот горшок, бросила... копать землю» і вырашыла «уйти с тем горшочком домой, но как сей еврей в месте том копал, то увидел, догнал и отобрал» знойдзеныя манеты [1, арк. 3, адв.].

Далей яна скардзіцца на тое, што гэты выпадак з ёй прадвызначаны Усявышнім, але ў выніку яна анічога не атрымала і просіць «донести до сведения... Дворного Правительства и просит защиты оного» і «отдачи означенных денег» [1, арк. 4].

Быў апытаны і «указанный девкою Ганулею Дусиновною раковский еврей... Кухель... от роду 22 года, ... женат, детей имеет ... грамоте еврейской умеет, штрафован ни за что не был, раковский мещанин показал, что действительно Ганука Дусиновна... нашла горшочек с деньгами, которые он полагал собственностью своею... найденные на содержащей им земле взял и никому... не по обязанности объявить не объявил, ныне же представил...» [1, арк. 4, адв. 4].

У адным з наступных дакументаў удакладняецца знешні выгляд гаршка – «сей горшок глиняный... с ушком» [1, арк. 5 ].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

18 верасня 1840 г. быў складзены адпаведны акт, у якім прыводзіцца папярэдняе азначэнне і метралагічныя звесткі пра знойдзены скарб [1, арк. 6].

14 кастрычніка 1840 г. рапарт Мінскага земскага суда перадаецца ў Мінскі павятовы суд. У ім адзначаецца, што манеты «по рассмотрению оказались серебряными старого польского чекана разных годов, больших 58 и меньших 162 штук, весом всего без горшочка 2 фунта $^{3}/_{4}$ золотника, и за приглашением минского пробирмейстера Антусикевича (?) четверть штуки одного сорту большего и три меньшие употреблены были на испытание и сплавку, сим... актом заключив, что серебро на этих деньгах есть 36 пробы (залатніковай. – І.К.)» [1, арк. 9, адв.].

У выніку ў павятовы суд былі прадстаўлены адпаведныя дакументы «с деньгами в горшочке большого сорта 57 и меньшего 159 штук за четырьмя штуками испорченными на сплавку и пробкою [прабіраванне. – І.К.]... для законного показания» [1, арк. 10].

Далейшы лёс скарбу дакументамі не вызначаецца, ці дайшоў ён да Імператарскай Археалагічнай камісіі, невядома. Абапіраючыся на тыя сціплыя звесткі, што ўтрымліваюць прыведзеныя матэрыялы, можна, тым не менш, зрабіць спробу прыблізнай рэканструкцыі дэпазіту.

Што вядома аб знойдзеных манетах:

- упакоўка – гліняны гаршчок памерам «больш за кватэрку» (кватэрка – $^{1}/_{4}$ кварты = 0,175 л);
- колькасць манет – 220 экз. (58 экз. – «вялікія» і 162 экз. – «меншыя»);
- агульная маса манет – 2 фунты $^{3}/_{4}$ залатніка (1 фунт = 409,51241 г, залатнік = 4,266 г);
- манеты білонныя, залатніковай пробы 36 (адпавядае метрычнай пробе 375);
- манеты «старога польскага чакана розных гадоў».

Такім чынам, можна меркаваць, што 220 манет 375-й метрычнай пробы былі польскай білоннай чаканкі XVIII ст.

***Крыніцы:***

1. *Дело о найденном кладе 220 штук старой серебряной монеты на земле помещика Здеховского (16.10.1840 – 21.01.1841). Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – Ф. 159. – Мінскі павятовы суд (1796–1873). – Воп. 1. – Спр. 363. – Арк. 10.*
2. *Рябцевич, В.Н. Топография монетных кладов Белоруссии: дис. ... канд. ист. наук / В.Н. Рябцевич. – Л., 1965. – 598 л.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ